# Чытаем па-беларуску

Падрыхтавала Лаковіч Ксенія, вучаніца 7 «Б» класа ДУА
«Сярэдняя школа № 2 г. Быхава»

# «Горкі ліпавы мёд»

Алена Васілевіч



# Алена Васілевіч

Васілевіч Алена Сямёнаўна – беларуская пісьменніца, заслужаны работнік культуры.

Творы Алены Васілевіч дакладныя ў апісанні побыту і раскрыцці характараў людзей. У іх паэтычнае бачанне свету, стрыманая, даверлівая манера апавядання, жывая народная мова.

Твор «Горкі ліпавы мёд» пісьменніца напісала ў 1985 г. Дзякуючы яму, Алена Васілевіч атрымала шмат ўзнагарод.



# Прадмова

Вядома, кожны чалавек любіць нешта незвычайнае і асаблівае. Тое, што можа здзівіць, прымусіць сумаваць або радавацца, дзесьці выклікаць слёзы, а дзесьці — усмешку.

Менавіта такой з’яўляецца кніга Алены Васілевіч «Горкі ліпавы мёд». Цікавая гісторыя, незвычайныя героі, а галоўнае — яркія эмоцыі. Усё гэта застанецца ў прыемных успамінах пасля чытання добрай аповесці.



# Змест

Андрэй прыехаў у свой родны горад, каб перадаць пісьмо. Ён ідзе па знаёмых вуліцах, успамінаючы пра сваё дзяцінства. Калісьці юнак жыў на Камсамольскім бульвары. Бацька Андрэя рана памёр ад інфаркту, і яны з маці засталіся зусім адны.

Жылі неверагодна бедна, не хапала нават на хлеб! Каб хоць неяк выжыць, маці ўзяла дзвюх кватарантак — Дашу і Ліду. Дзяўчаты асабліва ім не плацілі. Але іх сваякі забяспечвалі сям'ю дровамі.

Даша была камандзіркай, бойкай і гордай дзяўчынай. Яна вельмі любіла танцы, і кавалераў у яе было вельмі шмат. Ліда — поўная супрацьлегласць. Яна была сціплай і ціхай. На дзіва, хлопец закахаўся менавіта ў яе.





Аднойчы хадзіў з Лідачкай зімою на каток. Увесь час моцна трымаў яе за руку. Гэты дзень успамінаўся яму, як самы лепшы. У сваіх марах ён уяўляў сябе вельмі моцным. Уяўляў, як выратуе Ліду ад хуліганаў. Апошнім часам Андрэй вельмі змяніўся: стаў чысцей апранацца, сачыць за сабой, не біўся ў школе. Ён так хацеў падабацца Лідзе! Але аднойчы ўбачыў яе з іншым хлопцам. Ліда была такая шчаслівая, радасна смяялася.

Даша ужо даўно ўсё разумела. Таму называла Ліду дурніцай: хлопец Ліды дрэнна пра яе адгукаўся пры іншых, а Андрэя Ліда зусім не заўважала.

А потым... Дзяўчынкі здалі экзамены і з’ехалі. На жаль, хлопец Ліды не прыйшоў яе праводзіць. Дзяўчыну пасадзіў на цягнік Андрэй. Ён папрасіў Ліду напісаць яму. Праз некаторы час ім з маці прыйшла пасылка. Аднак, акрамя слоіка ліпавага мёду, там нічога не было. Андрэй плакаў горкімі слязьмі.



# Мае ўражанні

Прачытаўшы «Горкі ліпавы мёд», я зразумела, што вельмі важна шанаваць час, дзяцінства. Усё пройдзе. Усё! Застануцца толькі ўспаміны.

Патрэбна зрабіць усё, каб гэтыя ўспаміны былі добрымі, каб яны заўсёды грэлі сэрца. Трэба старацца жыць так, каб потым не шкадаваць аб невымаўленых словах, аб згубленай магчымасці, аб часе, страчаным дарэмна…






Чытанне па-беларуску прыносіць мне сапраўднае задавальненне. Прыемна чытаць такія цікавыя творы, як «Горкі ліпавы мёд» Алены Васілевіч, напісаныя на нашай роднай мове і на цікавую для многіх тэму. Ніякіх цяжкасцей пры чытанні я не адчувала. Усе словы былі зразумелымі і, я б сказала, мяккімі, далікатнымі, «падыходзячымі» для аповеду пра першае каханне.